УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны
лінгвістычны ўніверсітэт»
_______________ А.П. Бяценя
«31» мая 2023 г.

Рэгістрацыйны № УД-440/02/108-Г /вуч.

# ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА (У КАНТЭКСЦЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ)

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасцей:

1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па накірунках)» / 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)»;

1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па накірунках)» / 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)»;

1-02 03 08 «Замежная мова» (з пазначэннем мовы) / 6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)»

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Вялікая Айчыннай вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» для ўстаноў вышэйшай адукацыі (зацверджана намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 14.12.2022 г. Рэгістрацыйны нумар № ТД-СГ.038/тып.) і вучэбных планаў па спецыяльнасцях 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па накірунках)» / 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)»; 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па накірунках)» / 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)»; 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)» / 6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)».

.

**УКЛАДАЛЬНІКІ:**

С.Я. Новікаў, загадчык кафедры гісторыі і сацыяльных навук установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі і сацыяльных навук установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», (пратакол № 10 ад 5 мая 2023 года);

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», (пратакол № 9 ад 31.05.2023)

# І. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» з’яўляецца важнай складовай часткай сістэмы сацыяльна-гуманітарных і грамадска-палітычных ведаў, трывалай асновай для вывучэння заканамернасцей і асаблівасцей развіцця беларускай нацыі ў міжваенны перыяд і гістарычных выпрабаванняў у час Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. Вывучэнне дадзенай вучэбнай дысцыпліны арыентавана на фарміраванне ўстойлівых уяўленняў аб ваенным мінулым і вытоках перамогі савецкага народа.

Вучэбная дысцыпліна «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» з’яўляецца складовай часткай сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі перакладчыкаў, лінгвістаў, спецыялістаў па міжкультурнай камунікацыі, выкладчыкаў замежных моў.

Навукова-тэарэтычны змест праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» складзены ў адпаведнасці з арыгінальнай навуковай канцэпцыяй гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з улікам найноўшых дасягненняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі на аснове архіўных дакументаў і матэрыялаў. Айчынная гісторыя падаецца ў праграме ў кантэксце сусветных падзей з выкарыстаннем метадалагічных падыходаў, звязаных з асвятленнем вайны як агульначалавечай з’явы. Інавацыйнай адметнасцю праграмы з’яўляецца прадстаўленне зместу вучэбнага матэрыялу ў кантэксце канструявання ўласна беларускага вобраза гістарычнага мінулага. Такі вобраз звязаны з фарміраваннем гістарычнай памяці сучаснага беларускага грамадства ў межах ажыццяўлення дзяржаўнай гістарычнайпалітыкі Рэспублікі Беларусь, накіраванай на замацаванне беларускай нацыянальнайканцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі памяці ва ўмовах спроб фальсіфікацыі прычын і вынікаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Мэтай вывучэння вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца фарміраванне грамадска-палітычнага светапогляду студэнтаў, які будзе садзейнічаць іх самавызначэнню ў працэсе паглыбленага асэнсавання подзвігу савецкага народа і геапалітычных урокаў Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў, захаванню і ўмацаванню гістарычнай памяці аб ролі Савецкага Саюза і краін антыгітлераўскай кааліцыі ў Перамозе над германскім нацызмам, трансляцыі гістарычнай праўды і норм паводзін, каштоўнасцей і традыцый, выпрацаваных беларускім народам у перыяд пераадолення трагічных ваенных падзей.

Асноўнымі задачамі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» вызначаны:

1) фарміраванне ў студэнтаў грамадзянскіх і патрыятычных якасцей асобы;

2) выхаванне ў студэнцкай моладзі пачуцця адказнасці за будучыню сваёй дзяржавы і сусветнага супольніцтва;

3) фарміраванне ў студэнтаў ведаў аб гераічных і трагічных уроках Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, паўсядзённым жыцці насельніцтва на акупаванай тэрыторыі і ў савецкім тыле, укладзе прадстаўнікоў шматнацыянальнага народа Беларусі ў разгром германскіх захопнікаў, уплыве ваенных падзей на лёсы народаў Савецкага Саюза і Еўропы.

У сістэме сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбнымі планамі спецыяльнасцей 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па накірунках)» / 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)»; 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па накірунках)» / 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)»; 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)» / 6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)».вучэбная дысцыпліна «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» з'яўляецца дысцыплінай кампанена установы вышэйшай адукацыі цыкла (модуля) сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

У агульнай сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў змест вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» вынікае з ведання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» студэнт павінен:

***ведаць:***

- асноўныя перыяды Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў і іх змест;
- сутнасць акупацыйнай палітыкі германскіх улад;
- месца і ролю Беларусі ў геапалітычных працэсах у міжваенны перыяд і ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў,
- уклад беларускага народа ў Перамогу над нацызмам і яе гістарычнае значэнне;
- прыклады гераізму, мужнасці, самаахвярнасці абаронцаў Радзімы – воінаў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў, удзельнікаў руху Супраціўлення і вайсковых фарміраванняў саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі;
- розныя пункты гледжання на праблемныя пытанні ў асвятленні падзей і вынікі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

***умець:***

- характарызаваць становішча беларускага народа і яго ролю ў барацьбе супраць германскіх захопнікаў у розныя перыяды Вялікай Айчыннай вайны;

- раскрываць чалавеканенавісніцкі характар германскай акупацыйнай палітыкі;

- характарызаваць эвалюцыю геапалітычнага становішча беларускай дзяржавы ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;

- вызначаць крыніцы і ацэньваць значэнне Перамогі савецкага народа;

- ушаноўваць памяць пра подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

- супрацьстаяць фальсіфікацыям ў асвятленні падзей і вынікаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, прыводзіць аргументы і выказваць асабісты пункт гледжання.

***валодаць:***

- навукова-тэарэтычнымі ведамі, неабходнымі для сацыялізацыі асобы студэнта (вырашэння сацыяльна-асабістых задач);

- практыка-арыентаванымі ўменнямі, звязанымі з канкрэтнай спецыяльнасцю, па якой арганізуецца навучанне студэнтаў ва ўстанове вышэйшай адукацыі;

- сістэмным і параўнальным аналізам, даследчыцкімі навыкамі. міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» забяспечвае фарміраванне наступных светапоглядных і грамадзянска-палітычных кампетэнцый:

- патрыятызму, якія праяўляюцца ў гатоўнасці да замацавання дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь праз сваю прафесійную дзейнасць з улікам ведання небяспекі вырашэння міжнародных праблем ваеннымі сродкамі; у рэалізацыі і выкананні сваіх канстытуцыйных правоў і абавязкаў грамадзяніна на аснове ведання гістарычнага вопыту беларускага народа, назапашанага ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

- асобаснай арыентацыі, якія звязаны з уменнем фармуляваць уласныя светапоглядныя прынцыпы (пункт гледжання) на аснове гістарычных урокаў Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў для Беларусі, суадносіць перспектывы ўласнай жыццядзейнасці з перспектывамі развіцця сучаснага беларускага грамадства;

- сацыяльнага ўзаемадзеяння, якія прадугледжваюць фарміраванне ўмення абгрунтоўваць свае адносіны да норм паводзін і каштоўнасцей, выпрацаваных беларускім народам у час ваенных выпрабаванняў на аснове арыентацыі ў яго гістарычным досведзе;

- камунікацыі ў сучасным інфармацыйным грамадстве і глабальным шматпалярным свеце з улікам умення захоўваць гістарычную памяць пра ролю Савецкага Саюза і яго саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі ў Перамозе над германскім нацызмам і на аснове прытрымлівання талерантных традыцый беларускага народа.

Змест вучэбнай дысцыпліны, формы кантролю і тэхналогіі навучання накіраваны не толькі на набыццё студэнтамі тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў, неабходных для засваення спецыяльнасці, але і на

развіццё каштоўна-асобаснага, духоўнага патэнцыялу навучэнцаў, фарміраванне ў іх грамаўска-патрыятычных якасцей, гатоўнасці да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці беларускай дзяржавы.

Пры вочнай (дзённай) форме атрымання вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па накірунках)» / 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)»; 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па накірунках)» / 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)» дысцыпліна разлічана на 72 вучэбныя гадзіны, з якіх 36 – аўдыторныя гадзіны, у тым ліку: 22 – лекцыйных, 14 – семінарскіх гадзін, 36 – самастойная работа студэнтаў; для завочнай формы па спецыяльнасці 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)» / 6-05-0113-08 « Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)» дысцыпліна разлічана на 72 вучэбных гадзін, з якіх 8 – аўдыторныя гадзіны: 8 – лекцыйных гадзін, 64 – самастойная работа студэнтаў.

У якасці формы прамежкавага кантролю па выніках вывучэння вучэбнай дысцыпліны прадугледжаны дыферэнцыраваны залік. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 2 залікоўвыя адзінкі.